Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 16 (150) | 1—10 чэрвеня | 1934 г.

ЗМЕСТ

Сінаптычны агляд за першую дэкаду чэрвеня.

З пачатку дэкады вобласць высокага ціску займае цэнтральную Еўропу, Англію і Скандынавію.

Цыкланічная дзейнасць развіваецца ў цэнтры і на ўсходзе Еўрапейскай тэрыторыі Саюза.

Такім чынам у першыя тры дні БССР знаходзіцца пад уплывам вобласці павышанага ціску ў масах кантынентальна-палярнага паветра.

Дзякуючы гэтаму мы маем сухое надвор'е з паступовым падвышэннем тэмпературы, выкліканым прагрэвам паветра.

З 4 чэрвеня вобласць высокага ціску размяшчаецца над Ісландыяй, Скандынавіяй і поўначчу нашага Саюза. Цыкланічная дзейнасць аслабявае ў цэнтры Еўрапейскай тэрыторыі Саюза і побач развіваецца над цэнтральнай Еўропай і Заходняй часткай Саюза з паслядоўным рухам на ўсход.

У выніку гэтага 5 і 6 чэрвеня ў нас наглядаецца няўстойлівае надвор'е з праходзячымі дажджамі.

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі пагляд. мінімум
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	11	13	14	15	17	18	16	17	17	17	—	16	—	24	2	2
	3	П. лацк	11	13	14	15	17	18	14	16	18	17	—	15	15	24	3	2
	—	Вялікія-Лукі	—	—	—	—	—		—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова - Каралёва	12	12	12	15	15	17	12	16	17	14	—	14	15	22	5	2
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	11	13	14	14	17	18	14	14	17	16	—	15	—	23	5	1
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	11	13	14	15	17	19	15	13	18	17	—	15	16	23	4	3
	16	Менск	12	13	15	16	18	18	15	12	17	18	—	16	16	24	2	1
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	—	12	14	16	17	18	15	13	17	16	—	15	16	22	3	2
	25	Асіпавічы	14	14	16	16	18	18	15	13	17	18	—	16	17	24	4	3
	10	Орша	14	12	13	16	16	18	13	14	16	15	—	15	16	23	5	2
	19	Горкі	14	13	13	15	15	17	12	14	16	15	—	14	16	22	4	2
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	11	13	15	16	18	—	15	13	17	17	—	15	—	23	4	1
	30	Мар.-Сосны	12	12	15	15	18	17	13	14	17	17	—	15	17	23	2	3
	21	Магілеў	—	13	13	15	16	18	14	14	17	16	—	15	16	23	5	3
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	14	12	13	15	16	19	14	14	17	15	—	15	16	23	5	2
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	14	13	14	16	17	18	14	14	17	17	—	15	17	—	4	3
	32	Жлобін	13	13	15	16	18	18	14	14	17	18	—	15	16	24	5	3
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	13	13	16	15	18	17	13	12	16	18	—	15	17	24	4	2
	37	Калінкавічы	13	14	16	16	19	19	13	15	16	17	—	16	17	25	5	3
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	14	14	14	17	18	18	13	15	18	18	—	16	17	23	6	3
	35	Васілевічы	13	13	16	16	17	19	13	15	15	17	—	15	17	25	3	3
	40	Людвічава	14	13	15	16	17	20	13	15	15	17	—	16	17	24	3	3

назіранняў за 1—10 чэрвеня 1934 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі ў мм												Метэаралагічная з'ява (у дужках адзначаны числы)
	Максімал.	Мінімальны.	Чысло, калі нагляд. мінімум	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сума	
69	—	2	2	0.3	..	0.1	..	1.0	..	..	..	1.0	..	—	2.4	туман (2), граза (4, 5, 7)
51	—	—	—	0.3	..	..	9.0	0.5	..	15.0	..	..	0.3	—	25.1	граза (5, 7)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
56	35	—2	2	..	..	..	3.0	12.0	..	20.0	..	2.0	..	—	37.0	—
55	—	2	2	..	..	..	5 0	..	..	18.0	0.1	..	..	—	23.0	туман (5)
—	—	—	—	..	..	0.2	0 1	..	..	23.0	15.0	0.2	..	—	38.5	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	6	3	..	..	..	0.4	..	0.6	..	29.0	17.0	..	—	47.0	туман (10)
54	35	3	1	..	..	0.3	1.0	..	5.0	16.0	10.0	0.4	..	—	32.7	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
59	37	2	2	..	..	2.0	..	1.0	34.0	10.0	30.0	..	..	—	77.0	град
56	—	5	3	..	..	2.0	3.0	..	38.0	8.0	31.0	..	..	—	82.0	туман (5)
51	—	5	2	..	..	..	2.0	..	..	10.0	3.0	2.0	..	—	17.0	туман (5), граза (9)
55	39	4	3	..	..	..	0.1	2.0	0.5	22.0	2.0	0.5	..	—	27.1	туман (5), граза (9)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	граза (3, 6)
69	—	2	3	..	..	2.0	..	..	27.0	7 0	15.0	..	..	—	51.0	—
62	—	—1	2	..	..	8.0	12.0	0.1	55.0	6.0	4.0	1.0	..	—	86.1	граза (4, 6), лівень (6, 7)
57	—	—	—	..	..	..	5.0	1.0	4.0	20.0	4.0	1.0	..	—	35 0	туман (6), граза (5)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
60	—	—	—	..	..	..	3.0	0.1	9.0	9.0	2 0	..	..	—	23.1	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
59	35	4	1	..	..	..	13.0	..	22.0	8 0	23.0	0.2	..	—	66.2	граза (3)
59	—	—	—	..	..	..	..	..	33.0	7.0	19.0	0.1	..	—	59.1	граза (4), туман (7)
65	—	—	—	..	..	2.0	0.4	..	42.0	0.6	18.0	5.0	..	—	68.0	граза (6)
62	—	4	3	..	..	0.4	0.4	..	6.0	0.5	0.1	13.0	..	—	20.4	граза (9), бура (6)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	..	..	0.3	..	27.0	17.0	7.0	..	..	—	51.3	туман (6)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
57	36	3	3	..	..	0.1	1 0	..	15 0	2 0	4.0	0.5	..	—	22.6	граза (1), лівень (6)
61	—	—	—	..	..	0.1	0.4	.	11.0	1.0	9.0	5.0	..	—	26 5	туман (10)
57	40	1	1	2.0	..	3.0	3.0	0.1	5.0	0.1	0.1	14 0	0.1	—	27.4	туман (5 ,6)

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 1—10 чэрвеня 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы — Напрамак	Вецер: Пераважаючы — Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю — Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю — Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме — Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме — Ніжняя	Сярэдні стан паверхновага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	NE	4	N	7	—	8	3	сухая
	3	Полацк	NE	4	NE	7	—	6	6	вільготная
	—	Вялікія Лукі	—	—	—	—	—	—	—	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Кара ёва	E	4	E	7	55	6	1	вільготная
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	NE	4	SE	—	—	6	—	вільготная
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	„
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	NW	4	E	7	—	6	6	вільготная
	16	Менск	NE	4	NE	10	—	6	6	„
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	NE	4	NE	7	—	8	6	вільготная
	25	Асіпавічы	NE	2	NE	4	—	8	6	мокрая
	10	Орша	NE	2	NE	10	—	6	3	вільготная
	19	Горкі	NE	4	NE	10	—	6	3	„
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	N	4	E	10	—	8	6	—
	30	Мар'іна-Сосны	W	2	W	7	—	6	6	мокрая
	21	Магілеў	NW	4	NE	10	—	8	6	вільготная
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	NW	4	NW	10	—	6	3	вільготная
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	NW	2	NW	7	—	6	6	вільготная
	32	Жлобін	E	4	NW	7	—	8	6	„
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	W	2	S	7	—	6	6	вільготная
	37	Калінкавічы	NW	2	SE	14	—	6	6	„
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	W	4	E	7	—	8	6	сухая
	35	Васілевічы	NW	4	E	7	—	8	3	вільготная
	40	Людзінава	N	4	NW	10	—	9	9	„

7 і 8 чэрвеня па тэрыторыі БССР праходзяць аблажныя дажджы, выкліканыя цыклонам, які рухаўся з паўднёвага Захада праз Венгрыю, Польшу на БССР і далей на ўсход.

9 і 10 чэрвеня наглядаецца спыненне ападкаў і кароткатэрміновае паляпшэнне надвор'я, выкліканае адыходам цыклона на Ніжнюю Волгу і Казакстан.

Наогул гэтая дэкада характэрна пераменным надвор'ем.

І. Рачыцкі.

Метэаралагічная характарыстыка за 1—10 чэрвеня 1934 г.

Тэмпература паветра ў гэтай дэкадзе значна павысілася ў параўнані з папярэдняй дэкадай. У першы дзень яна хісталася ад 11 да 14^0, потым паступова павышалася і 6 дасягнула $17—20^0$, 7 і 8 тэмпература некалькі знізілася, але ў апошнія дні зноў паднялася да $15—18^0$. Сярэдняя дэкадная т-ра хісталася ад 14 да 16^0. Яна была вельмі блізка да нармальнай, месцамі роўна, а месцамі на $1\cdot2^0$ ніжэй.

Максімальная т-ра хісталася ад 22 да 25, мінімальная ад 2 да 6^0.

Ападкі размеркаваліся надзвычайна няроўмерна на тэрыторыі БССР. Надзвычайна вялікімі ападкамі вылучаецца цэнтральная частка БССР. Мар'іна-Горка (Пухавіцкага р.) адзначана 77 мм, Асіпавічы—82 мм, Мар'іна-Сосны (Любанскага раёна)—86 мм, і яшчэ рад станцый адзначылі ад 50 да 70 мм. Значна меншыя колькасці ападкаў выпалі ў паўночнай частцы, 20—30 мм. На ўсходзе выпала таксама 20—30 мм, а месцамі і менш 20 мм, 20—25 мм выпала на паўднёвым усходзе ў раёне Калінкавічы-Гомель.

Асабліва значныя ападкі наглядаліся ў такія дні: 6-га да 30—50 мм, 7—да 20 мм, 8—да 30 мм. Большая частка ападкаў мела ліўневы характар, часам з навальніцамі.

Вятры пераважна паўночна-заходнія ўмеранай хуткасці.

Воблачнасць хісталася ад 60 да 80% агульнага пакрыцця неба.

Н. Малішэўская

Сельскагаспадарчая гідрамет. характарыстыка за 1—10 чэрвеня.

Пацяпленне, якое наступіла ў гэту дэкаду, з'яўлялася вельмі спрыяючым і неабходным фактарам для роста с/г культур, і не гледзячы на вялікую колькасць выпаўшых, асабліва ў цэнтральнай зоне БССР, ападкаў за дэкаду, якая прыкладна раўна месячнай норме, умовы для развіцця раслліннасці былі добрыя. Праўда, што адмоўным бокам ападкаў з'яўляўся характар іх выпадзення—ліўневы.

Азімае жыта ў паўднёвай палове Рэспублікі перайшло ў фазу красавання, азімая пшаніца знаходзіцца пераважна ў фазе каласэння, яравая пшаніца, авёс і ячмень вышлі ў трубку. Паўднёвыя станцыі (Васілевічы, Чэрыкаў) адзначаюць каласэнне ячменя.

Ацэнка становішча пасеваў, на апошні дзень дэкады, наступная: азімае жыта пераважна вышэй сярэдняга, азімая пшаніца, яравая пшаніца, авёс і ячмень—здавальняюча.

На поўдні пачынаецца красаванне ільну.

Пасцбішчы знаходзяцца ў здавальняючым становішчы.

Захворванняў заразнымі хваробамі і падзяжа жывёлы не наглядалася.

На працягу дэкады праводзіліся наступныя працы: праполка зернавых культур, уздым папару, праполка ільну і авашчных, месцамі пачалася касьба лугавых сенажацяў.

В. Стэфановіч.

Аўладаем тэхнікай.

Не гледзячы на настойлівыя патрабаванні аддзела метэаралогіі рабіць выпраўленне адлікаў (які чаму-небудзь паказаўся назіральніку памылковым) так, каб першапачатковы запіс быў яскрава бачны, усё-ж такі шэраг назіральнікаў гэтага не выконваюць. Напр,, мет. ст. Крычаў, Орша, Менск—аэрапорт, Калінкавічы, Віцебск, Слуцк, Жыткавічы, Барысаў, Дрыса, Лельчыцы-Бабічы, Чэрыкаў, Новае Каралёва, Бычыха, Асінторф, Жлобін, Мар'іна-Горка. Загадчыкі гэтых станцый не вядуць барацьбы, за ажыццяўленне гэтага патрабавання, але справа яшчэ горш, калі гэтае патрабаванне не выконваюць нават самі загадчыкі загадч. мет. ст. Орша т. Пятроў, загадч. мет. ст. аэрапорт тав. Агародаў). Застаўляюць біць асаблівую трывогу недапушчальныя выпадкі, калі назіральнікі выпраўляюць адлікі з мэтай падгонкі адных паказанняў да другіх. Так, ёсць выпадкі падгонкі паказанняў максімальнага тэрмометра пасля ўстрахвання да „сухога" (мет. ст. Жлобін, якой ужо некалькі разоў заўважвалася Сектарам апрацоўкі аб дрэнным устрахванні максімальнага тэрмометра).

Ёсць выпадкі падгонкі паказанняў гігрометра да адноснай вільготнасці (Крычаў—назіральнік Шэршнёва, Калінкавічы—назіральнік Ясновец, Орша—Дакурова, Сіўцова і сам заг. Пятроў), Ёсць і такі варыянт, як падгонка паказанняў „змочанага" да „сухога", так, каб вылучаная адносная вільготнасць па псіхрометрычным табліцам не разыходзілася значна з паказаннямі гігрометра (Менск—аэрапорт, загадч. Агародаў, Калінкавічы—Яскавец).

Такая падгонка з'яўляецца найбольш шкоднай таму, што гэта губіцца адзін з элементаў назіранняў вільготнасці паветра.

Гэтыя назіральнікі-бракаробы мабыць ведаюць аб тым, што ўсебаковы крытычны кантроль назіранняў выкрые іх фальсіфікацыю з галавой. Таксама бракаробы добра ведаюць, што правільныя назіранні нельга аднавіць. Якія-ж вынікі з гэтых, з пазвалення сказаць, назіранняў?

Такія назіральнікі і загадчыкі ўводзяць у заблуджэнне ўстановы, якія непасрэдна карыстаюцца гэтымі шкоднымі матар'яламі.

Далей гэтая фальсіфікацыя вельмі затрудняе кантроль над прыладамі. Значная розніца паміж максімальнай тэмпературай пасля ўстрахвання „сухім" тэрмометрам можа тлумачыцца тым, што максімальны тэрмометр „туга" ўстрахваецца і яго трэба змяніць. Розніца паміж адноснай вільготнасцю і гігрометрам можа быць вялікая і няўстойлівая і мяняць свой знак не таму, што назіральнік дрэнна вядзе назіранні па псіхрометру, але і таму, што стрэлка гігрометра не зусім добра пастаўлена, што волас яго дрэннай якасці, што ёсць трэнне ў асі.

Падгонка адлікаў затушоўвае недахопы прылад.

Адносна падгонкі паказанняў гігрометра да адноснай вільготнасці трэба яшчэ адзначыць, што яна таксама зрывае назіранні над вільготнасцю і ў зімовы час; назіральнікі добра ведаюць, што ў зімовы час, пры тэмпературы ніжэй —5° для вылічэнняў вільготнасці паветра, мы карыстаемся паказаннямі гігрометра і гэтыя паказанні выпраўляюцца папраўкамі, атрыманымі на падставе параўнання адлікаў гігрометра з адноснай вільготнасцю, пры тэмпературах паветра вышэй —5°, і вось гэтыя адлікі і фальсіфіцыруюцца.

Трэба рашуча палажыць канец усякім „падчысткам". Трэба даваць дакладна тое, што паказваюць прылады.

Мы маем, напрыклад, за красавік бягучага года забракаваную вільготнасць па наступным метстанцыям: Стара-Барысаў, Крычаў, Слуцк, Баркаўшчына, Бычыха, Калінкавічы, Менск—аэрапорт. Не зусім здавальняючыя назіранні па вільготнасці на наступных метпастах: Дрыса, Скрыгалава, Негарэлае, Орша, Барысаў, МББ, Лельчыцы, Жыткавічы, Жлобін.

У бліжэйшы час будуць друкавацца назіранні 1931 г., 1932 г., пачынаецца падрыхтоўка да друку 1933 г., будзем друкаваць і 1934 г., і шэраг метстанцый у гэтых зборніках назіранняў не пабачаць не толькі часткова сваей працы, але і цалкам. Акрамя гэтага, у сучасны момант Аддзел Прагнозаў вядзе працу па вывучэнню сінаптычных умоў утварэнняў туманаў на тэрыторыі БССР, праца гэта мае вялікае значэнне для нашай авіяцыі і абароны нашай краіны, але матар'яламі шэрага станцый нельга карыстацца, бо яны не даюць добраякаснага запісу назіранняў над туманамі.

У чым справа, што мы яшчэ не ўсе зразумелі лозунг барацьбы за высокае аўладанне тэхнікай даручанай нам справы, не дабіваемся высокай якасці нашай прадукцыі? Можа, Аддзел Метэаралогіі ГК АГМС дрэнна кіруе мет. станцыямі і наогул мет. ст. знаходзяцца ў дрэнных умовах? Т. т. назіральнікі, гэтага сказаць нельга—нашы мет. ст. не знаходзяцца ў дрэнных умовах працы. Метстанцыю наведвае інспектар, мет. ст. прыкладна ўкамплектаваны штатам. Уся прычына ў тым, што мет. станцыі не прыступілі да працы пасапраўднаму, вельмі рэдка дзе сустракаецца соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Не аб'яўлена барацьба за якасць. Кіраўніцтва выдае бюлетэнь, у якім кожны назіральнік можа ўдзельнічаць—пісаць аб незразумелых яму пытаннях, аб недахопах у працы ст. і самаго кіраўніцтва. Кожная мет. станцыя мае фундаментальныя кнігі, напрыкл. „Руководство мет. ст. II разр. Колобков—„Метеорол. приборы" Никитин и Бенуа „Метеорология" Шипчинский, „Основы метеорологии и климатологии" і інш., якія для асваення тэхнікі і палепшання якасці прадукцыі патрэбна толькі добра прапрацаваць, а кое-што і вывучыць.

Метады соцыялістычнага спаборніцтва за поўную добрасумленнасць працы, за высокую яе якасць, самакрытыка на старонках бюлетэня—падымуць працу кожнага назіральніка да ўзроўня лепшага ўдарніка.

Трэба мець толькі жаданне.

М. Міціна.

Адказ на запытанне загадчыка мет. ст. Жлобін т. Дэпенчука

Так як паказанні гігрометра, як вы пішаце самі, могуць быць больш і менш адноснай вільготнасці, то розніца паміж адноснай вільготнасцю і паказаннямі гігрометра можа быць і са знакам мінус і са знакам плюс Відавочна, яна будзе са знакам мінус, калі паказанні гігрометра больш адноснай віготнасці, і са знакам плюс (які звычайна не ставіцца), калі яны менш.

М. Міціна.

Да ведама ўсіх заг. і назіральнікаў гідраметэаралагічных ст. і пастоў

ВЫШЛІ З ДРУКУ НАСТУПНЫЯ НОВЫЯ КНІГІ

1. Д-р Бержерон — Трехмерно-связный синоптический анализ (из двух частей).

   Часть 1.

   Принципиальное введение в проблему образования воздушных масс и фронтов. С 36 рис. и 5-ю табл.—Цена 4 руб.

   Часть 2.

   Динамика и термодинамика фронтов и фронтальных возмущений. С 101 рис.—Цена 7 руб.

2. Б. П. Мультановский — Основные положения синоптического метода долгосрочных прогнозов погоды. Часть 1 (текст). Цена 4 руб. Часть 2 я (карты) выходит в ближайшее время.
3. А. Шмаус и А. Виганд — Атмосфера как колоид. Цена 1 руб. 25 коп.
4. Международный атлас облаков (с текстом). Цена 11 руб.
5. О. Машкевич — Практическое руководство для производства гидрологических прогнозов. Цена 1 руб. 75 коп.

ЖАДАЮЧЫЯ НАБЫЦЬ ДАНЫЯ КНІГІ ПАВІННЫ ЗВЯРНУЦЦА ПА АДРАСУ:

Москва, Орликов переулок, здание Наркомзема СССР. Центральное управл. ЕГМС СССР, Редакционно-Издательский отдел, 8-й этаж.

Кнігі высылаюцца накладным плацяжом.

Друкарня БелАН. Зак. № 209. Гарліт № 3991. Тыраж 600 экз. 1/2 арк.